Источник: "Звязда" - 2019-05-22

Не прапусці!

# Акадэмік пераселіцца ў акіян,

## або Навукова-папулярны падыход да роднай прыроды

**З 22 да 29 мая навуковыя арганізацыі Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі ўпершыню арганізуюць Тыдзень роднай прыроды. Мерапрыемства прысвечана Году малой радзімы. НПЦ НАН Беларусі па біярэсурсах, Інстытут эксперыментальнай батанікі, Цэнтральны батанічны сад НАН Беларусі і Інстытут лесу падрыхтавалі цэлы шэраг цікавых мерапрыемстваў.**

Так, **22 мая** ў Інстытуце эксперыментальнай батанікі адбудзецца семінар-адкрыццё, прысвечаны Міжнароднаму дню біялагічнай разнастайнасці. **23 мая** ў інстытуце пройдуць батанічны і заалагічны чацвяргі: будзе прачытана лекцыя «Ацэнка 25-гадовай дынамікі лясного покрыва на закінутых сельскагаспадарчых землях прыгранічных раёнаў Расіі і Беларусі па спадарожнікавых даных» і тэматычныя лекцыі вядучых навукоўцаў-заолагаў па праблеме захавання зуброў.

У гэты ж дзень стартуе IX Міжнародны навукова-практычны і навучальны семінар для студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў і работнікаў спецыяльнасці «Лясная гаспадарка» («Лясная справа») на тэму «Дынаміка, стан і маніторынг лясных экасістэм на асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях». Маленькіх мінчан і гасцей сталіцы парадуе цырымонія перасялення акулёнка па імені Акадэмік, які цяпер знаходзіцца ў адмысловым інкубатары, у мабільны музей-лабараторыю «Адкрыты акіян».

**24 мая** ў Цэнтральным батанічным садзе адбудуцца экскурсіі «Прыродная флора ў экспазіцыях і калекцыях Цэнтральнага батанічнага сада» і «Дэкаратыўныя расліны прыроднай флоры Беларусі». Вядучыя навукоўцы выступяць з лекцыямі-прэзентацыямі «Грыбы ў нашых лясах», «Лес і клімат», «Інвазійныя расліны Беларусі: мінулае, сучаснасць і будучыня».

У суботу і нядзелю, **25—26 мая**, з 10.00 да 18.00 у Цэнтральным батанічным садзе разгорнецца гульнявы сямейны фестываль «TOYDAY». Плануецца, што наведвальнікі змогуць не толькі ўбачыць рэдкія і знікаючыя віды раслін, але і набыць іх узоры ў краме сада.

**28—29 мая** адбудзецца I Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Веды і палітычныя інавацыі ў галіне аховы навакольнага асяроддзя паміж Захадам і Усходам: вывучаныя і не вывучаныя ўрокі».

На працягу ўсяго Тыдня роднай прыроды вядучыя навукоўцы арганізацый Аддзялення біялагічных навук НАН Беларусі будуць выступаць перад грамадскасцю, у сродках масавай інфармацыі, прымуць удзел у прэзентацыях і святочных мерапрыемствах.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надзея Нікалаева. Акадэмік пераселіцца ў акіян